# ЗАДАННІ
## Завочнага каманднага тура

**Каманда павінна прадставіць у Арганізацыйны камітэт рашэнні праблемных пытанняў (задач) па вызначанай форме. Два заданні (на выбар каманды) прадстаўляюцца на беларускай мове (дадатковае заданне на веданне беларускай прафесійнай юрыдычнай лексікі). У выпадку выканання на беларускай мове трох заданняў у заключны пратакол уключаюцца вынікі двух лепшых эсэ.**

## ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА

Эканамічнае вымярэнне права: межы выкарыстання канцэпцыі пры фарміраванні прававой палітыкі Рэспублікі Беларусь

## КАНСТЫТУЦЫЙНАЕ ПРАВА. АДМІНІСТРАЦЫЙНАЕ ПРАВА

Аптымізацыя сістэмы кіравання ў адукацыйнай сферы

## ГРАМАДЗЯНСКАЕ ПРАВА І ПРАЦЭС.
## ГАСПАДАРЧАЕ ПРАВА І ПРАЦЭС

Прававая палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне стымулявання дзелавой актыўнасці

# КРЫМІНАЛЬНАЕ ПРАВА І КРЫМІНАЛЬНЫ ПРАЦЭС

Генеральны дырэктар ААТ “Рассвет” Іваноў і галоўны бухгалтар Пятроўскі (не з’яўляюцца сузаснавальнікамі або акцыянерамі) распрацавалі план здзяйснення раскрадання фінансавых сродкаў узначальваемага прадпрыемства шляхам пералічэння і далейшага атрымання наяўных грашовых сродкаў па фіктыўных дагаворах аб пастаўцы на ААТ па завышаным кошце разнастайных камплектуючых дэталей для вытворчасці.

Выраб фіктыўных таварных дакументаў і атрыманне наяўных пералічаных грашовых сродкаў пагадзіўся ажыццяўляць індывідуальны прадпрымальнік Казловіч. Пры гэтым Пятроўскі растлумачыў яму, што гэтыя дзеянні ажыццяўляюцца для аслаблення падатковага бярэмя на прадпрыемства.

У далейшым, на працягу 3 гадоў, Івановым і Пятроўскім з разліковых рахункаў ААТ было пералічана на аснове фіктыўных дакументаў, якія прадстаўляліся Казловічам, грашовых сродкаў на суму, эквівалентную 50 тысячам базавых велічынь. У сваю чаргу Казловіч, які займаўся атрыманнем наяўных указаных грошай, пакідаў сабе ў якасці ўзнагароджання ад 3 да 5% ад сумы, якую атрымліваў наяўнымі, а астатняе перадаваў Іванову і Пятроўскаму, якія выдаткоўвалі іх паводле свайго меркавання.

Акрамя таго, прадстаўленыя Казловічам грашовыя дакументы аб завышаным кошце камплектуючых дэталей для вытворчасці ўключаліся ў бухгалтарскі ўлік ААТ, што пацягнула зніжэнне падаткаабкладаемай базы і недаплату падаткаў на агульную суму 5 тысяч базавых велічынь.

Кваліфікуйце дзеянні ўдзельнікаў здарэння.